УДК 821.163.3

***Вольга Аляксандраўна Буднік***
*магістр філал. навук, аспірант 4-га года навучання каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
**Olga Budnik**
*Master of Philology, 4th Year Postgraduate Student of the Department of Belarusian Philology*
*of the Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: budnik84@bk.ru

# КАНЦЭПТУАЛЬНАСЦЬ, ГЕРОІ І НАРАТАЛАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РАМАНА «ЧАКАЙ У ДАЛЁКІХ ГРЫНЯХ» І. ПТАШНІКАВА

*Аналізуецца вобразная сістэма і тыпалагічныя сыходжанні герояў. Разглядаецца праблема пошуку героямі ўласных шляхоў у жыцці, іх самавызначэння, духоўных і маральных каштоўнасцей у сучасным. Выяўлены рэалізаваныя І. Пташнікавым нарatyўныя прыёмы ў рамане. Адзначаны матыў пошукаў пісьменнікам свайго мастацкага бачання свету, выразнай ідэйнай канцэпцыі, уласнай манеры, стылістыкі пісьма ў пачатку пісьменніцкай творчасці.*

***Ключавыя словы:*** *стыль пісьменніка, паэтыка твора, маральны канфлікт, унутраны маналог, канцэпцыя героя, тыпалогія герояў, наратыўныя стратэгіі, прыём рэтраспектывы, апавядальная манера, аб'ектываваны наратар, часапрасторавая плынь.*

## Conceptuality, Characters and Narratological Features of the Novel «Wait in Distant Hryni» by I. Ptashnikau

*The system of literary figures and typological convergences of heroes are analyzed. The problem of the heroes search for their own ways in life, their self-determination, spiritual and moral values in the present is considered. Narrative techniques implemented by I. Ptashnikau in the novel are revealed. The motive of the writer's search for his artistic vision of the world, clear ideological concept, his own manner, style of writing at the beginning of his literary career is noted.*

***Key words:*** *writers style, poetics of the work, moral conflict, internal monologue, hero's concept, typology of heroes, narrative strategies, retrospective technique, narrative style, objectified narrator, spatio-temporal flow.*

### Уводзіны

Першая кніга апавяданняў і аповесцяў «Зерне падае не на камень» (1959), а таксама раман «Чакай у далёкіх Грынях» («Маладосць», № 9–12, 1960) сталі адметным пачаткам творчага шляху Івана Пташнікава – празаіка. Яны засведчылі прыхільнасць аўтара да вясковай тэматыкі, глыбокае веданне паўсядзённага побыту, звычаяў, псіхалогіі вяскоўцаў, а таксама здольнасць маладога пісьменніка грунтоўна і ўсебакова паказваць дыялектыку характараў, праўду рэальных абставін жыцця беларускай вёскі другой паловы 50-х гг. ХХ ст.

У першых аповесцях і апавяданнях І. Пташнікаў ставіў перад сабой задачу намаляваць чалавека максімальна набліжана да жыцця. Але ўжо рамане «Чакай у далёкіх Грынях» вырашэнне гэтай першапачатковай задачы перастала задавальняць пісьменніка. Яго цікавіць заглыбленне ва ўнутраны свет асобы. На першы план маладым празаікам вылучаецца характар чалавека, матывацыя яго паводзінаў, імкненне да псіхалагічнага аналізу. Раман «Чакай у далёкіх Грынях», па нашым меркаванні, выклікае цікавасць менавіта пошукамі аўтарам сваёй творчай індывідуальнасці і пісьменніцкага стылю. Далейшай творчасцю І. Пташнікаў гэта яскрава паказаў.

Падзеі рамана адбываюцца ў беларускай вёсцы сярэдзіны 1950-х гг. Гэта быў час, калі літаратура павінна была ўмешвацца ў вырашэнне сацыяльных і вытворчых праблем і па-мастацку іх адлюстроўваць. Сельская гаспадарка і праблемы, звязаныя з ёй, нарэшце сталі, у большай ці меншай ступені, прадметам адкрытага абмеркавання. Гэта быў час, калі літаратарам дазвалялася пісаць аб «рашучай барацьбе» з недахопамі ў сельскай гаспадарцы і ў сферах грамадскага жыцця. Смерць Сталіна 5 сакавіка 1953 г. падштурхнула даўно наспеўшы працэс аднаўлення грамадства. Ён закрануў усе сферы жыцця грамадства – палітычную,

---

*Навуковы кіраўнік – З. П. Мельнікава, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускай філалогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

эканамічную, сацыяльную, духоўную. «Хрушчоўская адліга», XX з'езд КПСС (1956 г.) з яго выкрываннямі культу асобы выклікалі глыбокія змены ў грамадска-палітычнай свядомасці. Гэта стала спрыяльнай глебай для ажыўлення літаратуры: намеціліся новыя тэндэнцыі, звязаныя з актывізацыяй грамадскага жыцця, пачаўся працэс пераадолення апісальнасці, назіраецца мастацкае заглыбленне ва ўнутраны свет герояў, у сутнасць канфліктаў пасляваеннай эпохі. У пісьменніцкім асяроддзі разгарнулася дыскусія аб месцы пісьменніка ў жыцці грамадства, аб неабходнасці перагляду ўстаноўленай у літаратуры і мастацтве тэорыі бесканфліктнасці. На першы план паступова вылучаюцца агульначалавечыя маральна-этычныя каштоўнасці, барацьба за маральную чысціню і светлае ў чалавеку.

Найчасцей у такія пераломныя для грамадства моманты літаратура вельмі чула і адкрыта рэагавала на змены ў грамадстве і на першы план у творах вылучаўся выкрывальны характар. Пафас выкрыцця і адмаўлення з'яўляецца натуральным для творчасці пісьменнікаў другой паловы 1950-х – пачатку 1960-х гг., калі псіхалагічна дакладнымі і асабліва каларытнымі з'яўляюцца адмоўныя персанажы – гультаі, абібокі, п'яніцы, аматары пажыць для сябе. У гэты час з'ўяляюцца сатырычныя апавяданні Я. Брыля «Прывал», «Субардынацыя», А. Кулакоўскага «Кватаранты» і інш.

Як слушна заўважыў крытык Я. Гарадніцкі, «літаратурны твор заўсёды нясе ў сабе адзнакі часу, у які ён створаны» [2]. Таму актуальны ў той час «выкрывальніцкі» характар не абмінуў і творы маладога пісьменніка І. Пташнікава. Мастак слова псіхалагічна дакладнымі і каларытнымі паказваў супярэчлівых персанажаў (аповесць «Ілля Чачык», «Лонва»). Гэта яскрава праявілася і ў рамане І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях», дзе асноўныя падзеі і ўзаемадачыненні персанажаў твора носяць у пераважнай большасці выкрывальны характар. Але разам з тым у рамане яскрава паказваюцца пошукі героямі ўласных шляхоў у жыцці, іх самавызначэння. Маральныя канфлікты перанесены ў асабісты свет герояў. Гэта выяўлена праз іх стасункі і ўзаемаадносіны, праз пошукі гармоніі і шчасця ў асабістым і грамадскім жыцці.

Асноўную сюжэтную лінію твора складае паўсядзённае жыццё і праца жыхароў вёскі Грыні. У цэнтры рамана – вобраз маладога фельчара Галіны, якая яшчэ толькі пачынае свой прафесійны і жыццёвы шлях, а таксама вобразы маладых спецыялістаў: журналіста Леаніда, маладога настаўніка Васіля Міронавіча, які, як і Леанід, мае цёплыя пачуцці да Галіны.

Увага пісьменніка скіравана на пошукі маладой вясковай інтэлегенцыі сябе ў новы час, а таксама на праўдзівае адлюстраванне ўзаемаадносін маладых сучаснікаў. Галоўная гераіня рамана Галіна – дваццацігадовая дзяўчына – падаецца аўтарам разумнай, справядлівай і разважлівай. У вёсцы ёй давяраюць, да яе прыслухоўваюцца. У яе рамантычныя адносіны з Леанідам, маладым перспектыўным студэнтам-журналістам. На пачатку твора здаецца, што яна яшчэ не ўпэўнена да канца, ці хоча звязаць свой лёс з ім, бо не так даўно развіталася з другімі хлопцамі – Аркадзем і Васілём Міронавічам. Кожны з трох хлопцаў кахае Галіну і жадае быць з ёю. Дзяўчыну гэта непакоіць, для яе цяжка зрабіць правільны жыццёвы выбар. Аўтар часта праз ўспаміны гераіні вяртае чытача ў яе мінулае, да згадак пра адносіны з Аркадзем і Васілём. Увесь час яна, успамінаючы моманты, звязаныя з гэтымі героямі, параўноўвае іх. Так яна ўспамінае Аркадзя: *«Мінулае зноў ажывае ў памяці... Села яна на Аркадзеў веласіпед з маторчыкам... І панёс ён яе па вуліцы, па выгане аж да рэчкі... Яна разгубілася... Услед тады бег Аркадзь..."* [3, с. 182]. Гераіня нават прызнаецца сабе, што знешнасцю падобная да яго. *«Такая ж белабрыска... Толькі вось недзе старэйшая гады на два»* [3, с. 30]. Але пасля знаёмства з Леанідам яна беспаваротна закахалася ў гэтага юнака. Галіна нават сама здзіўлена сваімі моцнымі пачуццямі да хлопца: *«Падабаліся ёй і раней хлопцы, ды не было радасці, не паступаўся боль, не ажывала душа... А ён? Ён не такі, як усе. Але ж кожны думае так заўсёды пра чалавека, без якога няма спакою... Яна ўсміхнулася."Няўжо яшчэ хто так можа пакахаць, як я, недарэка?»* [3, с. 94]. Праз унутраныя маналогі пісьменнік раскрывае перажыванні гераіні. Яна памятае ўсе дэталі знаёмства з Леанідам. Думкі і ўспаміны пра хлопца настолькі ўзрушаюць яе душу, што на вачах нават наварочваюцца слёзы. Але ад згаданых пачуццяў, яна адчувае палёгку: *«Прыйшло каханне – прыйшлі і слёзы. Куды знік спакой... Скрыпнуць дзверы – ён; бразне клямка ці весніцы – здрыгаешся, падасіся да акна, шу-*

*каеш яго вачыма і баішся нечага... Не ведала Галіна, што каханне – слёзы... Але слёзы – раса... Аднекуль пасля находзіць шчырасць, а то і радасць – хочацца тады гаманіць бясконца несціся на край свету, як узвей-вецер»* [3, с. 93].

Аўтар неаднаразова падкрэслівае: хоць Галіна яшчэ зусім маладая, але яе паважаюць у вёсцы. Гэта асабліва добра бачна ў сцэне, калі малады фельчар наведвае хворую Ганну, маці Рамана Пэрца. Жанчына з вялікай удзячнасцю і нават любоўю ставіцца да дзяўчыны, ласкава звяртаецца да Галіны – «дачушка». Гэта добра відаць таксама ў эпізодзе, калі да Галіны з далікатнай просьбай прыйшла Ніна. Дзяўчына зацяжарыла ад гультая Рамна Пэрца, і, каб пазбавіцца ад сораму, вырашыла зрабіць аборт. Галіна праявіла сябе чалавекам далікатным і мудрым. Фельчар змагла пераканаць усхваляваную дзяўчыну не рабіць гэтага. Жыццё для яе – *«веліч, радасць і каханне... Жыццё дае бачыць і тварыць. Падсячы, падрань яго, – і ты не птушка, ты – камяк, ты чвакнешся ў снег, у гразь. Жыццё – гэта крылы»* [3, с. 172]. Як бачым, у думках і паводзінах дзяўчыны многае ішло як ад узвышаных уяўленняў пра каханне і мацярынства, так і ад цвярозых маральных развag. У вобразе Галіны І. Пташнікаву ўдалося выявіць народны тып беларускай жанчыны, узнавіць яго ў адпаведнасці з маральнымі ўяўленням беларусаў. Пісьменнік псіхалагічна праўдзіва раскрывае характар і ўнутраны свет гераіні ў разнастайных індывідуальных праяўленнях.

Значная ўвага аўтара нададзена яшчэ аднаму герою – Леаніду. Ён студэнт журфака, пачынаючы журналіст. Ён ужо друкуе свае артыкулы ў мясцовай газеце пад псеўданімам *Г. Леанідаў*. У вёсцы ў клубе ён *«чытае лекцыі пра Месяц, космас»*. Леанід – тыповы прадстаўнік тагачаснай моладзі. Перакананы камсамолец, ён выступае супраць царквы і святароў. Рэлігія для яго ў адпаведнасці з тагачаснымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі – «опіум народа» [3, с. 100]. Герой упэўнена паўтарае антырэлігійныя выказванні, што *«вера ў бога ніколі нікога яшчэ не ўзнясла на неба... што яна – рушнік тых, хто, прысвоіўшы чужое, хоча ўцерці і душу і рукі... нават ад крыві. Яна – для цемрыва»* [2, с. 100]. Гэты герой прадстае перад чытачамі разумным і разважным, але бескампрамісным ў дачыненні да ўсяго таго, што супярэчыць яго камсамольскім перакананням. І разам з тым Леанід сціплы, а гэта якасць, як трапна заўважыла Галіна, *«у наш век упрыгожвае чалавека»* [3, с. 55].

Пасля знаёмства з Галінай Леанід закахаўся. Аўтар вельмі яскрава апісвае першую сустрэчу маладых людзей, параўноўвае пачуццё першага кахання з першым вясеннім вылетам пчол: *«Каму даводзілася бачыць, як вылазіць з зямлі пчала? Спачатку яе не відно, толькі чуецца ціхенька мц.. мц... мц... Пасля з'явіцца галоўка, і вось пчолка раптам зазвініць, зайграе, закружыцца, затрымціць ля выгладжанай норкі і, як тая страла, чыркне ў паветра... Так і Леанід пазнаў Галіну, калі раніцай, роўна ў дзевяць, адчыніў дзверы ў лабараторыю»* [3, с. 52].

Чытач адчувае жаданне аўтара ў вобразе Леаніда ўвасобіць канцэпцыю гарманічнага героя, якому ўласцівы не толькі чалавечыя пачуцці, але які надзелены добрым розумам. Гэта даволі яркі характар, у якім спалучаюцца *тыповыя рысы маладога чалавека таго часу.* Ва ўчынках і думках Леаніда выразна бачыцца *аўтарская пазіцыя* – стварыць вобраз ідэальнага героя-сучасніка. Уяўленне пра характар гэтага героя фарміруецца ў чытача праз адлюстраванне знешніх і ўнутраных праяў асобы Леаніда. Малады журналіст не баіцца напісаць у мясцовую газету выкрывальны артыкул пра гультая Рамана Пэрца, не баіцца прыйсці на размову ў дом святара, айца Сабольскага, і з камсамольскім запалам агітуе яго жыць згодна з ідэямі камунізму, а не божага запавету. Леанід паказаны аўтарам як новы тып незалежнага чалавека з перадавымі сацыяльна-палітычнымі і педагагічнымі поглядамі. Вобраз Леаніда ўспрымаецца сёння як гістарычна абумоўлены. Гэты герой – тыповы прадстаўнік моладзі 60-х гг.: яго думкі і паводзіны скіраваны ў будучыню, у яго свае, адрозныя ад прадстаўнікоў старэйшага пакалення, погляды на жыццё. Герой новага часу чуйна рэагуе на змены ў грамадстве.

Падрабязна апісваецца і псіхалагічна дакладна раскрываецца ў рамане і *вобраз Аркадзя* – яшчэ аднаго маладога чалавека, які кахае Галіну. Ён – настаўнік у вёсцы Грыні. Праз успаміны героя аўтар згадвае адносіны Леаніда з Галінай: *«Каханне... Памяць захавала той зімовы вечар... Галіна, у накінутым на плечы паліто, ішла недзе з агарода. Углядзела яго – уздрыгнула. Не прывіталася, нічога не адказала, калі прывітаўся ён»* [3, с. 244]. Хлопец кахае дзяўчы-

ну, нават аднойчы пацалаваў яе. Але для Галіны гэта быў неабдуманы ўчынак, пра які яна, здаецца, шкадуе. Галіна аддала перавагу іншаму і папрасіла Аркадзя больш не думаць пра яе: *«Ты добры, Аркадзь... Ты сам ведаеш, які ты добры... Толькі не думай больш пра мяне... Не хадзі...»* [3, с. 244].

Перажыванні і думкі аб дзяўчыне, першае каханне, якое, нажаль, не прынесла сапраўдай радасці, аўтар паказвае, перадаючы меланхалічны настрой героя. Аркадзь разуме, што кахае без узаемнасці, *«што наперадзе толькі мука»* [3, с. 80], і сам задае сабе цалкам лагічнае пытанне: *«Ці не лепш цяпер пакінуць думаць пра яе, Галіну?»* [3, с. 80]. І. Пташнікаў эмацыянальна дакладна перадаў псіхалагічны стан героя. Але разам з тым заўважана, што эмацыянальны настрой не мае моцнага ўнутранага напружання. Як слушна заўважыў літаратуразнаўца С. Андраюк, *«станоўчыя персанажы... ў праўнанні з адмоўнымі, атрымаліся некалькі схематычныя, без глыбокага жыццёвага напаўнення... адносіны да прыроды, каханне, дачыненні да спраў рэлігійных, на што ў першую чаргу скіраваны інтарэсы станоўчых герояў, ні для аднаго з іх не сталі на гэты час нечым асноўным, сэнсам і мэтай жыцця»* [1, с. 37]. Непераканаўчасць станоўчых герояў рамана, як заўважае С. Андраюк, абумоўлена занадта статычнымі характарыстыкамі і звышспрошчаным канфліктам паміж станоўчымі персанажамі і іх антыподамі, якія намаляваны часам у трохі іранічнай манеры, абсалютна не ўласцівай І. Пташнікаву, да якой ён больш так і не вярнуўся. Але, па нашым меркаванні, як было ўжо заўважана раней, малады пісьменнік толькі пачынаў свой творчы шлях ў жанры прозы, і таму кіраваўся сваім бачаннем свету, уласнымі пошукамі героя.

У вобразнай тапалалогіі твора аўтар адметна выяўляе аблічча супярэчлівых герояў. Сярод іх – *Раман Пэрэц. «Раманку пераваліла за дваццаць гадоў. Працуе ён за прычапнога і хоча, каб яго звалі Аляксандравічам. Але яго клічуць Раманка – пляснівы грыб»* [3, с. 51]. Так аўтар адразу і адназначна канстатуе, што гэта адмоўны герой. Раман – аматар выпіць, распуснік і балбатун. Але сустрэўшы першае ў жыцці каханне, адчуўшы дабрыню і давер да сябе, хлопец мякчэе душою. Яго погляд на акаляючы свет, на жыццё становіцца яснейшым і больш дакладным і лепшым. Спачатку Ніна, якая ад яго зацяжарыла, не верыла ў тое, што ён зможа стаць добрым бацькам для дзіцяці і мужам для яе. Нават увогуле, ці захоча ён ажаніцца з ёю: *«Які з яго бацька... У нядзелю вунь... Прывёз аднекуль з лесу снегу на багажніку... і цэлы вечар у дзяўчат шпурляўся. Бацька...»* [3, с.264]. Але, як бачым, ён мае рашучы намер павярнуць сваё жыццё ў стваральнае русла дарослага мужчыны, *«рашыў ачалавечыцца»* [3, с. 264].

Як можна пераканацца, для І. Пташнікава было важна паказаць свайго героя ў дынаміцы, у маральным росце. Праз вобраз Рамана Пэрца пісьменнік яскрава паказвае, як каханне можа змяніць чалавека ў лепшы бок, узвысіць яго духоўна.

Праз вобразы іншых супярэчлівых герояў, таксама жыхароў вёскі, такіх як *Джвучка, Выжлятнік, Авар'ян,* І. Пташнікаў асуджае драпежна-спажывецкія адносіны да прыроды родных мясцін. Аўтар, па сутнасці, зрабіў гэты момант вырашальным у ацэнцы адмоўных персанажаў. У імкненні пісьменніка завастрыць увагу ў творы на негатыўных момантах жыцця, такіх як п'янства, гультаўства, прысваенне чужога, канфлікце паміж сумленнымі, чыстымі, прыгожымі душой людзьмі і носьбітамі спажывецкай маралі, добра выяўляецца аўтарская пазіцыя.

Неабходна падкрэсліць, што ў першым рамане І. Пташнікаў уздымаў вельмі важную і сёння праблему – лёс духоўных і маральных каштоўнасцей у сучасным свеце. Ярка і выразна завастрыў мастак гэту праблему ў вобразе нікчэмнага п'яніцы Рамана, гаспадарлівага Авар'яна, які хоць і схапіў за руку злодзея Платона, але ж і сам не абмінае тое, што «дрэнна ляжыць». Людзей, якія крадуць на полі, пісьменнік вельмі ўдала назваў «стрыгунамі». З вострым сялянскім поглядам на жыццё і вострай рэакцыяй на ўсё несправядлівае аўтар пераконвае і чытачоў асудзіць Выжлятніка і Джвучку, якія крадуць і прапіваюць агульнае дабро. Несумненна, што І. Пташнікаву было важна правесці лінію размежавання паміж дабром і злом, сцвердзіць сваю маральную пазіцыю, таму пісьменнік так палярна размясціў героеў: п'яніцам, злодзеям і гультаям Выжлятніку і Джвучку ў рамане супрацьпастаўлены сумленны і працавіты Авар'ян, іншыя героі – дзед Тодар, Ульяна, Аркадзь.

Згаданыя вобразы выяўляюцца аўтарам як станоўчыя чалавечыя і грамадскія

тыпы. Для пісьменніка было важным паказаць праўдзівыя вобразы жывых людзей з іх рознямі якасцямі. Зусім відавочна, што, нягледзячы на ідэалагічную рэгламентаванасць у тагачасным жыцці і літаратуры, пісьменнік у сваіх творчых пошуках ішоў ад жыццёвай праўды. Менавіта па гэтай прычыне ў рамане цяжка размежаваць галоўных і другарадных герояў. Асноўная мастацкая ўвага скірава на паказ асобы ў кантэксце складанага часу.

Матыў гармоніі беларуса, чалавека працы з прыродай – таксама адзін з асноўных ў рамане. Выразна прачытваецца думка аўтара: вялікаае шчасце, якое мае беларус, – шчасце ад блізкасці з прыродай, шчасце ад працы на сваёй роднай зямлі. Праз тыпалогію герояў аўтар перадае грамадскую атмасферу 50-х гг. XX ст., выяўляе важныя маральна-этычныя ідэі эпохі постсталінізму. Праз сісэму персанажаў і спосабы абмалёўкі герояў выразна акрэслівалася творчая пазіцыя маладога пісьменніка, яго асабістая грамадская пазіцыя.

Важным сродкам выяўлення аўтарскай канцэпцыі і ацэначнай пазіцыі з’яўляюцца *нараталагічныя падыходы*, якія рэалізуе пісьменнік у творы. Бо, нават з улікам пільнай, часам негатыўнай увагі навукоўцаў якраз да гэтага твора, наша задача – наблізіць яго сапраўдны змест да сучаснага чытача.

Выбар пісьменнікам пэўнай апавядальнай манеры заўсёды з’яўляецца важным элементам паэтыкі твора. Наратар у рамане «Чакай у далёкіх Грынях» не персаніфікуецца, не паведамляе нічога пра сябе, непасрэдна не ўдзельнічае ў падзеях рамана. Ён аб’ектываваны, недыегетычны (тэрмін В. Шмідта) [4, с. 65.] Функцыі аўтара і наратара ў дадзеным выпадку супадаюць. Аповед у рамане вядзецца ад трэцяй асобы, што дазвалаяе аўтару абстрагавацца ад уласнага *«Я»*, аналізаваць і ацэньваць усё як бы «збоку», што садзейнічае ўражанню аб’ектыўнасці ў чытача. Але моманты «падтэкставага біяграфізму» выразна апазнаюцца пры аналітычным даследаванні твора.

У пачатку рамана аўтар-наратар акрэслівае асноўнае месца – прастору, з якой звязаны амаль усе сюжэтныя падзеі. Дзеянні твора адбываюцца, у чым лёгка перакanaцца, на малой радзіме пісьменніка. У апавядальнай манеры, у эстэтыцы аповеду адчуваецца адказнасць празаіка перад землякамі, яго жаданне ўзвысіць свой народ, у абсалютнай большасці працавіты, маральны, трывушчы. Гэта невыдакова, бо творца «вясковай» прозы нарадзіўся і выхоўваўся менавіта ў гэтым асяроддзі, добра ведаў рэаліі і розных людзей, якія «ажылі» ў рамане. Пісьменнік з незвычайнай настальгічнай цеплынёй прыгадваў родныя мясціны: *«Ёсць недзе зімовая дарога цераз Брады на Рудню; тудою мелі звычку ездзіць дзяды, калі яшчэ там, як кажуць, быў тартак. Бліжэй. А цяпер, калі ўсхадзілася переступленая плацінай рака, Брады заплылі»* [3, с. 23]; *«Шаша вяла ў Крашчанскія лясы, пад Камена – да былой некалі пагранічнай заставы, – а цяпер – у суседнюю вобласць, туды, на Іллю і Краснае»* [3, с. 39]. Адразу бачна кранаючае аўтарскае і наратарскае жаданне падкрэсліць значнасць гэтых дарагіх мясцін. Падзеі ў рамане маюць часавую і прасторавую канкрэтнасць. Відавочныя і зразумелыя чытачу і часавыя контуры твора.

Кампазіцыя рамана ўяўляе сабой адзіны апавядальны пласт. Але часам аўтар ужывае наратыўныя прыёмы рэтраспекцыі – вяртанні ва ўспамінах герояў у мінулыя часы, згадкі, роздумы аб мінулым. Вось, напрыклад, стары Дзедзіха ўспамінае мінулае: *«Дзедзіха ўздрыгвае… У памяці раптам ажывае далёкі ўспамін... Было адразу пасля вайны. Па лясах сноўдаліся ваўкі, акрамленыя, здужэлыя. Ніхто іх не кратаў, – аблаў тады не рабілі. Пачалі яны ўлетку браць дзяцей – з двароў, з выганаў, накідвацца на людзей у дарозе»* [3, с. 163]. Прыём успамінаў ужывае аўтар і для ўвасаблення ўнутранага свету герояў. Так, эпізодамі ўспамінаў аўтар дапаўняе ўнутрана-псіхалагічнае аблічча галоўнай гераіні Галіны: *«Мінулае зноў ажывае ў памяці… Села яна на Аркадзеў веласіпед з маторчыкам… І панёс ён яе па вуліцы… Услед бег Аркадзь, крычаў, што было сілы, куды і што круціць. Збелася ўся вёска. На хаду падхапілі з сядла… Як цяпер, памятае, – павісла на руках у некага, а у лужыне храпе праклятыя маторчык»* [3, с. 182].

Разгортванню розных часовых пластоў аповеду спрыяюць таксама ўнутраныя маналогі герояў і разгорнутыя рытарычныя пытанні, якія, часам, задае наратар свайму герою. Праз такія пытнні-развагі выяўляецца аўтарская прысутнасць ў творы, яго ацэначныя адносіны да герояў і яго ўласныя маральна-каштоўнасная погляды. Наратар часта сам развважае з персанажам: *«Як цяжка кахаць, калі ведаеш і мо верыш, што дарэмна… Ці не ад усяго гэтага ў грудзях агонь?»* [3, с. 80]. У такіх выпадках відавоч-

нае актыўнае суперажыванне, аўтарскі пункт гледжання на тое, што адчувае герой. Праз каханне Аркадзя да дзяўчыны, напрыклад, наратар паступова выяўляе вялікую любоў героя да родных мясцін, да пушчы, да жыцця ўвогуле: *«Аркадзь у самой пушчы... Тут можна забыцца, што кахаешь некага аднаго; тут душа адгукаецца на кожны рух ляснога жыцця; тут люба ўсё – і дымка над пасекай, і купіністае балота, і халодны мрок лесу»* [3, с. 82]. І тут жа наратар ставіць рытарычнае пытанне: *«А можа, такое ад таго, што ў кожным руху, у кожнай праяве прыроды жыве той, хто змушае на ўсё глядзець закаханымі вачыма?»* [3, с. 82]. Аўтар аргументуе, што чалавек, які любіць прыроду і тонка адчувае яе, мае сапраўды жывую душу і сур'ёзную псіхалагічную сталасць.

**Заключэнне**

Як можна пераканацца, пісьменнік ахвотна карыстаецца прыёмам рэтраспекцыі, што значна паглыбляе ідэйнае напаўненне, часава-прасторавую плынь і з'яўляецца важным сродкам псіхалагічнай характарыстыкі герояў. Праз рэтраспектыўныя эпізоды ўдала завастраецца ўвага чытача на важных падзеях жыцця герояў. Апавядаючы пра іх пошукі, пра сюжэтныя падзеі ў рэтраспектыўна выбарачным часава-прасторавым парадку, аўтару, на наш погляд, удалося ярчэй адлюстраваць плынь тагачаснага жыцця беларускай вёскі і яе жыхароў, шматгранна і пераканаўча ўвасобіць ідэйную задуму твора.

Устаноўлены наступныя асноўныя наратыўныя прыёмы ў рамане: супадзенне пунктаў гледжання наратара і персанажа, прыёмы рэтраспекцыі, успамінаў і рэфлексіі герояў, паказ дынамікі вяртання адмоўнага героя ў станоўчае русла, выяўленне аўтарскага пункту гледжання праз перадачу маўлення іншых персанажаў і разгорнутыя рытарычныя пытанні і нек. інш. Рэалізаваныя наратыўныя стратэгіі ў рамане І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Гранях» дапамаглі аўтару сцвердзіць, што сучаснасць і мінулае ў рэальным жыцці, як і ў лёсе герояў твора, цесна пераплятаюцца. Праз гэту сувязь пісьменнік адлюстраваў повязь пакаленняў, пераемнасць такіх найкаштоўнейшых маральных якасцяў беларускіх вяскоўцаў, як дабрыня, працавітасць, сумленнасць, здольнасць змагацца за справядлівасць і ўменне перамагаць.

Можна пераканацца, што першы раман І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях» вызначаецца скразным матывам пошукаў. І гэта тычыцца не толькі герояў рамана, якія яшчэ зусім маладыя і шукаюць сваё месца і прызначэнне ў жыцці. Сам аўтар твора ў той час знаходзіўся таксама яшчэ ў пошуках свайго мастацкага бачання свету, выразнай ідэйнай канцэпцыі, уласнай манеры, стылістыкі пісьма. Так фарміраваўся шлях І. Пташнікава, народнага пісьменніка Беларусі, да высокай культуры пісьменніцкага майстэрства.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Андраюк, С. Чалавек на зямлі. Нарыс творчасці І. Пташнікава / С. Андраюк. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 254 с.
2. Гарадніцкі, Я. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я. А. Гарадніцкі ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – С. 25.
3. Пташнікаў, І. Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1990–1992. – Т. 1 : Раман, апавяданні. – 1990. – 478 с.
4. Шмид, В. Нарратология / В. Шмид. – М. : Яз. славян. культуры, 2003. – 312 с.

REFERENCES

1. Andrajuk, S. Chalaviek na ziamli. Narys zhyccia i tvorchasci I. Ptashnikava. – Minsk : Mast. lit., 1988. – 254 s.
2. Haradnicki, Ya. A. Mastacki sviet bielaruskaj litaratury XX stahoddzia / Ya. A. Haradnicki ; navuk. red. U. V. Hnilamiodau. – Minsk : Bielarus. navuka, 2005. – S. 25.
3. Ptashnikau, I. Zbor tvorau : u 4 t. / I. Ptashnikau. – Minsk : Mast. lit., 1990–1992. – T. 1 : Raman, apaviadanni. – 1990. – 478 s.
4. Shmid, V. Narratologija / V. Shmid. – M. : Jaz. slavian. kul'tury, 2003. – 312 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 28.01.2021*